ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 225 (1192) | НЯДЗЕЛЯ, 28-га верасьня 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 30 "
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯХ.

Кошт асобнага №—2 кап.

ДА X ЗЬЕЗДУ КОМСАМОЛУ БЕЛАРУСІ

кожны комсамолец
і ўся працоўная моладзь
выпісвае і чытае газэту
„ЧЫРВОНУЮ ЗЬМЕНУ"

РАЗГОРТВАЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЕ

Гаспадарчы год канчаецца. Мы на парозе новага, асобнага кварталу. Гэты квартал—кастрычнік—сьнежань 1930 г. мае выключна важнае значэньне. **Ён не зьяўляецца працягам бягучага гаспадарчага году і ў тойжа час не ўваходзіць у будучы гаспадарчы год.** Ён будзе мець свой прамфінплян, які па тэмпах павінен адпавядаць заданьням, абмеркаваным у проэкце кантрольных лічбаў для першага кварталу 30-31 году. Акрамя таго, у гэтым квартале мы абавязаны поўнасьцю пакрыць даўгі, якія засталіся ў некаторых галінах прамысловасьці па выкананьню вытворчых заданьняў 2-га году пяцігодкі.

Усё гэта патрабуе ад гаспадарчых організацый, як цэнтральных, так і нізавых ад усіх партыйных і профсаюзных організацый напружаньня сваіх сіл. Трэба памятаць, што **падсумаваньні будучага кварталу зьяўляюцца рашаючымі дзеля забясьпечаньня яшчэ больш высокіх тэмпаў будучага гаспадарчага году.** Тут ня можа быць месца меркаваньням, што тое, што ня выканана на сёньня, будзе пакрыта заўтра. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на тыя вучасткі народнай гаспадаркі, дзе ў бягучым годзе мы мелі прарыў. Найбольш цяжкім зьяўляецца зараз становішча вугальнай прамысловасьці. Яе адставаньне, у значнай меры абумоўленае шкодніцтвам, прыняло зусім недапушчальныя формы.

Зараз перад вугальнай прамысловасьцю стаіць баявая задача:—**даць у надыходзячым квартале ня менш 17 мільёнаў тон вугалю, з якіх на Донбас** прыпадае 12 мільёнаў. Гэтае заданьне павінна быць выканана ва што-б там ні стала. Рашаючым тут **зьяўляецца выкарыстаньне мэханізмаў.**

На гэтай лініі скрываюцца яшчэ вялікія рэзэрвы. На пытаньнях скарыстаньня мэханізмаў павінна быць сконцэнтравана ўвага ўсяе рабочае масы, усяго тэхнічнага пэрсаналу, усіх гаспадарчых органаў вугальнай прамысловасьці. Разам з тым, патрэбна рашучая дапамога вугальнай прамысловасьці і ў першую чаргу Донбасу.

Рабочыя заводаў, якія забясьпечваюць Донбас, павінны паставіць пад асобы кантроль выкананьне яго заказаў. Партыйныя організацыі на мясцох вярбоўкі новых рабочых для Донбасу адказваюць за посьпех вярбоўкі, за якасны склад новых рабочых. Дасягнутыя палепшаньні ў справе забясьпечаньня Донбасу павінны быць замацаваны.

Мы павінны ўжо з пачатку новага кварталу разгортваць вытворчасьць машын дапасавальна да заданьняў, якія намячаліся на 1930-31 гаспадарчы год. Паміж тым, бягучы гаспадарчы год чорная мэталюргія—база машынабудаўніцтва—заканчвае са значным недавыкананьнем пляну. Адсюль задача—даць за пэрыод кастрычнік—сьнежань ня толькі тое, што належала па програме, але і пакрыць запазычанасьць. **Мэталь і вугаль—аснова індустрыялізацыі—ня могуць больш адставаць.**

Перанос пачатку гаспадарчага году дыктаваўся ўмовамі будаўніцтва, бо восеньню адыгрывае надзвычайна вялікую ролю ў агульным падсумаваньні будаўнічага сэзону. Старое выліченьне гаспадарчага году штучна разрывала будаўнічы сэзон. Цяпер гэты недахоп ліквідаваны. Тым больш неабходна дабіцца да пачатку новага гаспадарчага году максымальных посьпехаў на фронце будаўніцтва.

Пэрыодам кастрычнік—сьнежань заканчваецца найбольш напружаная частка асеньня-зімовых перавозак транспарту. Транспарт павінен быў ужо да 20 верасьня дасягнуць сутачнай нормы пагрузкі ў 57000 вагонаў.

Гэтае заданьне ня выканана. А норма—57000—гэта пераходная норма да яшчэ больш высокай—70000.

Патрабуецца рашучы пералом у працы транспарту, інакш гэтае заданьне застанецца на паперы.

Нарэшце, у наступным квартале павінна зрабіць буйныя крокі **лёгкая прамысловасьць.** Новы ўраджай тэхнічных культур пачынае паступаць на фабрыкі і заводы. Гэта дасьць нам магчымасьць безадкладна разгарнуць работу па мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў у лёгкай індустрыі, каб забясьпечыць у бліжэйшы час значнае палепшаньне забясьпечаньня рабочых.

Побач з разгортваньнем вытворчасьці мы абавязаны дабіцца значных посьпехаў і ў частцы эканомнага скарыстаньня апілу і дэфіцытных матар'ялаў, у асаблівасьці мэталю. Тут ускрываюцца новыя магутныя рэзэрвы для тэмпаў індустрыялізацыі.

Барацьбу за плян у наступным квартале мы абавязаны павярнуць тварам да якасных паказчыкаў. Трэба проста сказаць—без выкананьня пастаўленых заданьняў у частцы ўзьняцьця вытворчасьці працы, зьніжэньня сабекошту і рэзкага палепшаньня якасьці продукцыі плян выканан ня будзе. Трэба безадкладна абвясьціць паход мас на барацьбу за высокія якасныя паказчыкі, правесьці шырокую праверку таго, як організавана гэтая барацьба па ўсіх зьвеньнях прамысловасьці—ад прадпрыемстваў да аб'яднаньняў.

Задачы, якія прыпадаюць на кастрычнік—сьнежань 30 году,—вялізарны. Але гэта зусім выпрашальныя задачы. Трэба толькі па-бальшавіцку організоўваць барацьбу за іх выкананьне. Высокі ўраджай хлеба і тэхнічных культур, новы прыліў у колгасы, дасягнутыя, ня гледзячы на прарывы, высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці—усё гэта гаворыць за тое, што мы маем усе магчымасьці зрабіць квартал кастрычнік—сьнежань кварталам новых перамог на фронце соцыялістычнага будаўніцтва і ня толькі дабіцца выкананьня пастаўленых на квартал заданьняў і поўнай ліквідацыі прарываў бягучага году, але і перавыканаць намечаныя заданьні.

Мастацтва перамогі месьцішча ва ўменьні мобілізаваць масы і кіраваць імі. Яно патрабуе бальшавіцкай настойлівасьці і ініцыятывы і рашучай барацьбы з усім тым, што перашкаджае высокім тэмпам індустрыялізацыі. Яно патрабуе рашучай перамогі навер'я і хістаньняў, бязьлітаснага выкарчоўваньня ўсіх праяўленьняў опортунізму на практыцы.

З перадавой „Праўды".

Падрыхтаваць кадры піонэрпрацаўнікоў

„Чырвоная Зьмена" ня раз на сваіх старонках узьнімала пытаньне аб становішчы комсамольскага кіраўніцтва піонэрорганізацыяй, завастрыла ўвагу аб падрыхтоўцы належных кадраў піонэр-працаўнікоў.

Вельмі вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы кадраў піонэрпрацаўнікоў можа аказаць усебеларускі рабоча-сялянскі унівэрсытэт па радыё, у якім маецца цэлы шэраг факультэтаў, (работы і рацыяналізацыя колгаснага будаўніцтва, савецкага будаўніцтва, політасьветны пэдагагічны факультэт з аддзяленьнем піонэр-працаўнікоў). Ва унівэрсытэт прымаюцца рабочыя, колгасьнікі, бедпякі, служачыя, якія маюць веды ня менш 4-х годкі, тэрмін навучаньня два гады.

У аснове навучальнай працы факультэтаў будзе ляжаць лябораторны плян занятнаў. Радыё заняткі будуць аб'яднаны завочнай сыстэмай. Слухачом будуць высылацца на рукі навучальныя матар'ялы.

Неабходна комсамольскім ячэйкам на мясцох правесьці адпаведную растлумачальную работу, каб забясьпечыць максымальны ахоп гэтым унівэрсытэтам, у прыватнасьці на аддзяленьне піонэр-працаўнікоў, комсамольцаў (піонэр-працаўнікоў) і наогул комсамольскі актыў.

П. Л.

НОВЫ ЦЭХ ІНДУСТРЫІ—ПАД КАНТРОЛЬ КОМСАМОЛУ

Выведзем маладзёжныя атрады на баявыя вучасткі коопэрацыйнага фронту

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК УСЕЛКСМ АБ ОРГАНІЗАЦЫІ МАС КОМСАМОЛЬЦАЎ НА РАБОТУ ПА ГРАМАДЗКАМУ КАНТРОЛЮ НАД РАБОЧАЙ СПАЖЫЎКООПЭРАЦЫЯЙ

Рашэньнем ЦК УсеКП(б) ад 6-га верасьня 1930 г. комсамол абавязан „паставіць коопэрацыйную работу ў комсамольскіх організацыях так, каб яна была аднэй з стрыжнёвых задач комсамолу і каб рабочая моладзь выступала ў ролі застрэльшчыка рабочага кантролю і грамадзка-пролетарскай дапамогі для выкананьня баявых задач спажыўкоопэрацыі".

Выходзячы з гэтага, ЦК УсеЛКСМ абавязвае усе мясцовыя комсамольскія організацыі правесьці наступныя мерапрыемствы:

Аказаць усялякае садзейнічаньне і практычную дапамогу коопэрацыйным органам у пасьпяховым і хутчэйшым разгортваньні сеткі закрытых разьмеркавальнікаў як аднэй з форм клясавага разьмеркаваньня продуктаў і прамтавараў, стварэньня баз па дастаўцы тавараў на дом у мэтах барацьбы з чаргамі, а таксама прымацаваньня працоўных да пэўных гандлёвых адзінак. У гэтых мэта неабходна:

а) вышуканьне памяшканьня для організацыі закрытага разьмеркавальніка пры фабрыцы і заводзе, а таксама ўстанаўленьня кантролю за яго работай;

б) удзел у зьнішчэньні чаргі ў магазынах, як прымацаваных да фабрык і заводаў, так і недалёкіх ад вытворчасьці шляхам організацыі баз па дастаўцы тавараў на дом;

в) організацыя сапраўднай грамадзкай барацьбы з спэкуляцыяй дэфіцытнымі таварамі, уцечкай іх на прыватны рынак, змагаючыся з перавышкай цэн, устаноўленых Наркомгандлем, дабіваючыся правільнай выдачы і карыстаньня заборнымі кніжкамі. У прыватнасьці неабходна тэрмінова прыняць удзел у правядзеньні праверкі карыстаньня заборнымі кніжкамі,

г) організацыя збору прапаноў рабочых і іх жонак па палепшаньню работы спажыўкоопэрацыі (магазыны, сталовыя і г. д.).

Мясцовым камітэтам комсамолу прапануецца ў галіне палепшаньня грамадзкага харчаваньня забясьпечыць:

а) удзел у організацыі закрытых сталовых і буфэтаў, дабіваючыся абслугоўваньня ўсіх зьмен рабочых;

б) праверку своечасовага і поўнага забясьпечаньня продуктамі сталовых і буфэтаў;

в) зьнішчэньне чаргі ў сталовых і буфэтах;

г) павышэньне якасьці гатаваньня абедаў і сьнеданьняў і зьніжэньня цэн на іх шляхам зьніжэньня накладных выдаткаў звыш устаноўленага проценту прыбытку;

д) абавязаць раённыя камітэты УсеЛКСМ тэрмінова прымацаваць ячэйкі комсамолу да маючыхся сталовых, буфэтаў, закрытых разьмеркавальнікаў, абавязаўшы іх стварыць брыгады ў дапамогу сталовым для нагляданьня за чыстатой, за прыгатаваньнем харчаваньня;

е) кантроль за санітарным становішчам сталовых, буфэтаў, вытворчых і падсобных памяшканьняў;

ж) збор прапаноў рабочых па палепшаньню работы сталовай і буфэту.

У галіне організацыі сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў спажывецкай коопэрацыі комсамольскія організацыі павінны:

а) прыняць актыўны ўдзел у распрацоўцы плянаў будаўніцтва прыгарадных гаспадарак коопэрацыі (сьвінарнікі, малочныя фэрмы, гароды і г. д.);

б) абавязаць ячэйкі комсамолу праявіць ініцыятыву ў справе стварэньня колектыўных гародаў рабочых і служачых данага цэху, установы, бяручы на сябе абавязак нагляданьня за разгортваньнем гароднай гаспадаркі, вузорнай пастаноўкі работы ў ёй. Лічыць магчымым стварэньне спэцыяльных брыгад у дапамогу рабоце гародаў спажывецкай коопэрацыі;

в) аказаць практычную дапамогу коопэрацыйным органам у атрыманьні зямельных вучасткаў, насеньня і прыладаў;

г) лічыць неабходным разгортваньне комсамольскіх сьвінарнікаў па прыкладу комсамольцаў заводу „Чырвоны багатыр";

д) прыняць актыўны ўдзел у вышуканьні перавозачных сродкаў для перакідкі гародніны, а таксама адпаведных памяшканьняў па хаваньню яе. Устанавіць сталы кантроль за становішчам хаваньняў гародніны, організуючы дружыны з комсамольцаў па дастаўцы гародніны на дом.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на разьвіцьцё масавага рабочага кантролю і шэфства цэхаў і аддзелаў над асобнымі прадпрыемствамі коопэрацыі. Дзеля гэтага мясцовым камітэтам і ячэйкам комсамолу неабходна:

а) праверыць работу комсамольцаў у органах кантролю коопэрацыі (коопбюро, лавачныя і сталовыя камісіі), неадкладна адклікаць тых, якія ня справіліся з сваімі задачамі і няздольных да гэтай работы;

б) забясьпечыць актыўны ўдзел у ствараемых профсаюзамі рабочых кантрольных брыгадах;

в) організаваць пасты трывогі па рабочаму забясьпечаньню і г. д.;

г) прыняць шэфства ячэйкам комсамолу і піонэрскім атрадам над асобнымі прадпрыемствамі коопэрацыі (сьвінарнікі, фэрмы, буфэты, сталовыя і г. д.).

Аказаць усямерную дапамогу спажыўкоопэрацыі па збору паявых узносаў, мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў, укладаў і авансаў, організуючы з гэтай мэтай спэцыяльныя брыгады комсамольцаў і моладзі.

Абавязаць транспартныя ячэйкі ўстанавіць сталы кантроль за своечасовай адпраўкай і сьледваньнем продуктаў рабочага забясьпечаньня, не дапускаючы непатрэбных перавозак і псаваньня продуктаў.

Абавязаць вясковыя ячэйкі і райкомы комсамолу аказаць дапамогу с-г коопэрацыі ў загатоўцы сельгаспродуктаў для забясьпечаньня прамысловых груп рабочых (гародніна, масла, малако, яйкі).

Асабліва важнае значэньне для коопэрацыі мае пытаньне стварэньня новых пролетарскіх кадраў. Надаючы асаблівае значэньне справе ўмацаваньню органаў коопэрацыі пролетарскімі кадрамі, даручыць оргінструктарскаму аддзелу ЦК сумесна з сэктарам кадраў Цэнтрасаюзу ў двухдэкадны тэрмін намеціць конкрэтныя захады па вылучэньню ў органы спажывецкай коопэрацыі комсамольцаў і беспартыйнай моладзі.

У сувязі з невыстарчальнасьцю падрыхтаваных кадраў для работы ў спажыўкоопэрацыі даручыць аддзелу адукацыі і быту ЦК сумесна з Цэнтрасаюзам і Наркомасьветы распрацаваць пытаньне аб неадкладнай рэорганізацыі шэрагу школ II ступені ў коопэрацыйныя тэхнікумы.

Надаючы сур'ёзнае значэньне разьмеркаваньню вопыту работы асобных ударных і вопытных прадпрыемстваў спажыўкоопэрацыі, абслугоўваемых штатам моладзі (комсамольскія магазыны, комсамольскія сталовыя, комсамольскія ларкі) ЦК УсеЛКСМ абавязвае савецка-коопэрацыйны сэктар ЦК і газэту „Комсамольская Правда" організаваць усесаюзны агляд работы маладзёжных прадпрыемстваў коопэрацыі.

Даручыць савецка-коопэрацыйнаму сэктару сумесна з оргмасавым сэктарам Цэнтрасаюзу распрацаваць пытаньне аб скліканьні ў бліжэйшы час усесаюзнай нарады комсамольцаў, якія працуюць у спажыўкоопэрацыі.



Комсамольцы абгаварваюць адозву ЦК УсеКП(б).

Па Савецкай Беларусі

Раўняйцеся па перадавых

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 25. Скончылі першымі сяўбу і ўборку колгас „Пролетарская Перамога", „Комінтэрн", колгас імя ЦВК БССР і колгас „Першага Мая". У гэтых колгасах расьце ўадым колгасьнікаў.

Колгасьнікі заклікаюць працоўных гораду да поўнага выкананьня прамфінпляну.

Замест двух, пасылаем трох

Капыльская мястэчковая савецкая ячэйка, вітаючы заклік ЦК комсамолу аб мобілізацыі комсамольцаў на Донбас, дае замест вызначаных развёрсткаю РК 2 чалавек,—3-х лепшых, вытрымавейшых комсамольцаў. Мы сабралі 34 рублі для закупкі ад'яжджаючым комсамольцам касьцюмаў.

А. Смоткін.

Выслалі цыркуляры і... на гэтым спыніліся

У Стара-Дароскай організацыі ЛКСМБ ня прыдана ніякага політычнага значэньня мобілізацыі комсамольцаў у Донбас. Па разьвёрстцы ЦК ЛКСМБ, Стара-Дароскай організацыі трэба было мобілізаваць 10 комсамольцаў на Донбас і адправіць іх з першым эшалёнам.

РК ЛКСМБ абмежаваўся тым, што паставіў аб гэтым пытаньне на паседжаньні РК і даў ўказаньне кожнай ячэйцы да 20-га верасьня вылучыць па аднаму комсамольцу для паездкі на Донбас. На гэтым уся работа і скончылася. Райком чакае мобілізаваных.

Ячэйкі і РК КСМ ніякай растлумачальнай работы сярод комсамольцаў і беспартыйнай моладзі не праводзяць.

Комсамолец.

Новы колгас

Пасьля праведзенага растлумачэньня рашэньняў XVI партзьезду на хутарох **Селішча**, Слуцкага раёну, **організаваўся новы колгас пад назвай „Шлях колектывізацыі"**. У колгас увайшло 12 **бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Асеньнюю сяўбу колгасьнікі праводзяць колектыўна.**

Р. А.

13 верасьня дадзен старт усебеларускай сьвінаводчай эстафэце

ПРАЗ 17 ДЗЕН—ФІНІШ

Чэрвеньская, Лагойская і Кармянская райорганізацыі комсамолу ідуць да фінішу з рапартамі аб... бяздзейнасьці

По прыкладу комсамольскай ячэйкі „Расьсвет Пераможца“ будзьце організатарамі фабрык мяса і малака

Пакласьці канец бязьдзейнасьці і павольнасьці

13 верасьня Цэнтральным Камітэтам комсамолу Беларусі быў дадзен старт усебеларускай сьвінаводчай эстафэце, якая павінна была зьявіцца аднэй з форм мобілізацыі комсамольцаў, рабочых савгасаў, колгасьнікаў і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх мас моладзі і дарослых на выкананьне важнейшых задач па далейшаму разгортваньню і замацаваньню савгаснага і колгаснага будаўніцтва, практычнага вырашэньня сьвінаводчай проблемы.

Асноўныя задачы эстафэты: „Скапчэньне да тэрміну (1 кастрычніка) будаўніцтва сьвінарнікаў у колгасах і савгасах і ўкомплектаваньня іх сьвінаматкамі, і падрыхтаваньне кармавой базы—выкананьня вызначаных кантрольных лічбаў па будаўніцтву стандартных бакштаў, ям і траншэй і запаўненьня іх сілоснай масай да 1 кастрычніка 1930 г.

Фініш для перадачы эстафэты ячэек у райкомы комсамолу ўстаноўлен 14 кастрычніка — дзень сьвяткаваньня сьвята ўраджаю і колектывізацыі. **Сёньня роўна два тыдні з часу абвяшчэньня старту**, але зьмяшчаемыя ў сёньнешнім нумары матар'ялы аб ходзе будаўніцтва сьвінарнікаў, комплектаваньня іх сьвінаматкамі, будаўніцтва сілосных ям і запаўненьня іх сілоснай масай з усёй рашучасьцю сыгналізуюць аб **яўнай небясьпецы правалу эстафэты.**

Друкуемы сёньня матар'ял кажа аб тым, што паасобныя гора-кіраўнікі комсамольскіх організацый савгасаў і колгасаў напляваецельскі адносяцца да такіх важнейшых гаспадарча-палітычных задач, як сьвінагадоўля і сілосаваньне. Замест організацыі сапраўдных бальшавіцкіх ударных тэмпаў і ўпартасьці па шэрагу месц існуе праваопортуністычная павольнасьць—па сутнасьці зьдзекі над дырэктывамі партыі.

Як інакш характарызаваць той факт, што сэкратар Чэрвенскага РК КСМ ня ведае колькі у раёне маецца сьвінаводчых гаспадарак, факт бюрократычных адносін старшыні Лагойскага РВК да будаўніцтва сьвінарнікаў у савгасах і шэраг іншых фактаў.

Праз 17 дзён комсамольскія ячэйкі павінны перадаць у раённыя камітэты рапарты аб сваёй рабоце на адным з важнейшых вучасткаў колгасна-вытворчага паходу—сьвінагадоўлі.

Тэрмін вельмі кароткі—засталіся лічаныя дні. Ячэйкі павінны як найхутчэй напружыўшы свае сілы наверстаць упушчаны час.

Павольнасьці і бязьдзейнасьці пара нарэшце палажыць канец.

Комсамольскія ячэйкі гораду і дагэтуль ня ўключыліся у гэтае надзвычайна - важнае мерапрыемства партыі.

Стаяць у баку і быць пабочнымі гледачамі злачынна.

Уключайцеся і зараз-жа.

Х. Б-к.

„Забараняю адпускаць і кропка“

Старшыня Лагойскага РВК і РК ЛКСМБ зрываюць мобілізацыю колгасьнікоў на будаўніцтва сьвінарнікаў

Згодна апошняй пастановы Наркампрацы БССР, будаўніцтва сьвінарнікаў аб'яўлена пазачарговым.

Але работнікі Лагойскага раёну гэтай пастановы і прызнаваць ня хочуць.

Так, напр., старшыня РВК заявіў, што ўсялякія перакідкі рабочых на будаўніцтва сьвінарнікаў забараняе. Больш таго, РВК пераманіў 5 плотнікаў савгасу Бучаўшчына на будаўніцтва больніцы, якая па пляну павінна быць пабудавана ў 1930-31 г.

Ня гледзячы на пастанову Белколгасцэнтру аб перадачы 3-4 колгасьнікаў з кожнага колгасу на будаўніцтва сьвінарнікаў у распараджэньне Белколгасбуду, старшыня РВК заявіў:

— „Забараняю адпускаць і кропка“.

Райком комсамолу таксама бязьдзейнічае ў гэтым напрамку. Згодна разьвёрсткі ЦК ЛКСМБ, Лагойскі райком комсамолу павінен мобілізаваць у распараджэньне Белколгасбуду 37 комсамольцаў, але РК разьвёрсткі ня выканаў.

Мобілізаваныя комсамольцы ганеб на ўцяклі з будаўніцтва.

БРЫГАДЗІР НК ПРАЦЫ БССР—РЫБАКОЎ



Прыцягнуць да суровай адказнасьці

У Раваніцкім сельсавеце, Чэрвеньскага р-ну, у кожным з чатырох колгасаў с-савету патрэбна пабудаваць па аднаму сьвінарніку на 50 сьвінаматак. Гэтае заданьне павінна быць выканана да 1-га кастрычніка, **а між тым праца па будаўніцтву яшчэ і не** распачалася.

Многія колгасы, як „Будзёнавец“, зусім адмаўляюцца будаваць сьвінарнікі.

Раймалжывёлсаюз ніякіх **сродкаў на** будаўніцтва сьвінарнікаў **не адпусьціў**.

Ня лепш справа **з сьвінагадоўляй** у савгасе Равнічы. У **савгасе павінна** быць пастаўлена да 25-га верасьня 120 сьвінаматак, але гэтае заданьне ня выканана выключна **з-за халатнасьці кіраўніцтва савгасу.**

Зрываецца таксама і сілоснае будаўніцтва. Так, па 4-х колгасах намечана пабудаваць 10 сілосных ям, а пабудована толькі 3, а да запаўненьня іх сілоснай масай не прыступалі.

Колгас „Будзёнавец“ **зусім адмовіўся будаваць сілосную яму.**

Сарвана будаўніцтва 9 сілосных ям і ў савгасе **Раванічы**. Кіраўнік савгасу Раманоўскі зьяўляецца адным з зрыўшчыкаў сілосаваньня ў савгасе. Ён гаворыць:—Заданьне сам я назначаю, як гаспадар, а ня іх гэта справа.

Ніякай увагі разьвіцьцю сьвінагадоўлі і сілосаваньня не ўдзялілі комсамольскія і партыйныя ячэйкі.

Комсамольская ячэйка савгасу Раванічы ня ведае колькі патрэбна пабудаваць савгасу сілосных ям (?)

Віноўныя ў зрыве сілосаваньня і комплектаваньня сьвінаматкамі, а таксама ў зрыве будаўніцтва сьвінарнікаў павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

А. Л.

„У нас ніводнае сьвінаводчае гаспадаркі няма“

Комсамольская організацыя Чэрвеньскага р-ну—убаку ад сьвінагадоўлі

У Чэрвеньскім раёне налічваецца 6 колгасаў і савгасаў, якім нададзен сьвінагадоўчы ўхіл.

Раённыя організацыі, як РВК, райколгассаюз, сусім ня цікавяцца прысьпешыць будаўніцтва сьвінарнікаў у гэтых колгасах.

Райком комсамолу і зараз ня ведае ў якім стане знаходзіцца будаўніцтва сьвінарнікаў, па галавацяпску адносіцца да справы сьвінагадоўлі.

Калі ў сэкратара РК комсамолу запыталі: Колькі ў вас сьвінагадоўчых гаспадарак, дык ён адказаў—**ніводнае**.

РК ня толькі ня кіруе ячэйкамі, але і не правярае іх працы сьвінагадоўлі.

У савгасе „Новыя Зеленкі“ к канцу кастрычніка павінна быць пастаўлена 1000 сьвінаматак ангельскай пароды, а будаўніцтва сьвінарнікаў для іх яшчэ не распачата.

Сьвіньні павінны будуць стаяць на дварэ, пад адкрытым небам. Савгаская ячэйка комсамолу зусім бязьдзейнічае ў гэтай справе. На вачох комсамольскай ячэйкі тэхнік Шашкін сумесна з некаторымі рабочымі будаўніцтва шкоднічаюць і п'янствуюць.

Гэты тэхнік у свой час быў вычышчан з апарату, як чужы элемэнт, але невядома хто і як паставіў яго на адказную працу.

Прокуратуры трэба тэрмінова высьветліць шкоднікаў, якія зрываюць комплектаваньне сьвінаматкамі будаўніцтва сьвінарнікаў у савгасе „Новыя Зеленкі“.

Сымон Ціхі.

ПАДХАПІЦЬ ПАЧЫН КОМСАМОЛЬСКАЙ ЯЧЭЙКІ „РАСЬСЬВЕТ ПЕРАМОЖЦА“

Комсамольская ячэйка колгасу „Расьсьвет Пераможца“ Жлобінскага р-ну, першая з усіх комсамольскіх ячэек раёну прыступіла да ажыцьцяўленьня пастаноў партыі і комсамолу ў вырашэньні проблемы жывёлагадоўлі. На сходзе ячэйкі абгаварылі пытаньне аб падрыхтоўцы да пастаноўкі жывёлы на зімовы час і аб падрыхтоўцы хлявоў.

Ячэйка узьняла пытаньне перад праўленьнем колгасу, каб апошняе адвяло адзін жывёлаводчы двор, які будзе абслугоўвацца выключна сіламі комсамольскай ячэйкі.

Гэтая прапанова была вельмі горача спаткана колгасьнікамі і праўленьнем і задаволена.

Гэты пачын павінны падхапіць усе комсамольскія і колгасныя ячэйкі.

Брыгадзір „ЧЗ“, ЦК ЛКСМБ—ПАЛЯЎЦОЎ

Скарга сьвіней Кармянскага раёну

Даўно ўжо была выдана пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб разьвіцьці жывёлагадоўлі і ў першую чаргу сьвінагадоўлі. Але... у Кармянскім раёне на нас мясцовыя організацыі глядзяць як на нямаведама каго.

Райком КП(б)Б „паклапаціўся“ аб нас і вынес пастанову аб пабудове ў 6 колгасах сьвінарнікаў, але гэтым мы не задаволены, таму, што **будаўніцтва пачнецца ў 1931 годзе.**

Мы жадаем, каб зараз-жа загаварылі аб нас усе Кармянскія ўстановы і Кармянская комсамольская організацыя. Мы жадаем, каб нам далі добрыя „кватэры“, у якіх мы маглі-б прынесьці больш карысьці, чым стоячы на полі і ідучы пад нож.

Да гэтага часу ніводная комсамольская ячэйка ў раёне не паклапацілася і наогул адмахваецца ад нас.

Комсамольскія ячэйкі ніякай растлумачальнай кампаніі вакол разьвіцьця сьвінагадоўлі не праводзяць.

Як мы чулі, галоўная ўвага ў колгасна-вытворчым паходзе аддаецца нам—сьвіньням. Але, ізноў праклятае „але“, у нас на Кармяншчыне, як у райкоме комсамолу, так і ў Раймалжывёлсаюзе і слова не закінулі аб нас

І калі на раённай нарадзе комсамольскага активу аб колгасна-вытворчым паходзе было пастаўлена пытаньне аб нас, дык прадстаўнікі райколгассаюзу, раймалжвёлсаюзу не зрабілі ласкі прыйсьці.

Ці доўга так будзе?

Пакрыўджаныя сьвіньні.

Старт Усебеларускай эстафэце

Бюро Рагачоўскага РК ЛКСМБ, сумесна з штабам колгасна-вытворчага паходу, вынесла шэраг конкрэтных мерапрыемстваў па разьвіцьцю сілосаваньня і сьвінагадоўлі у раёне: У дапамогу колгасам пасланы 10 брыгад у 175 чалавек, спэцыяльна па сілосаваньню, рамонту і будаўніцтву сьвінарнікаў.

Старт Усебеларускай эстафэце па сілосаваньню і сьвінагадоўлі Рагачэўскім раёнам дан.

На сёньняшні дзень па раёне плян па будаўніцтву сілосных ям выканан на 90 проц.

Закладзена 2435 кубамэтраў, што складае 1596 тон.

Сэкратар РК КСМ ЖДАН

Пастановы засталіся на паперы

У колгасе „Новы Шлях“ Сьмілавіцкага раёну згодна пляну райколгассаюзу павінен быць пабудаваны сьвінарнік. Адпушчаныя для будаўніцтва сродкі райколгассаюз скарыстаў на... закупку гатунковага насеньня. Такое становішча наглядаем і ў колгасе „16 партызан“.

Нічога ня робяць і комсамольскія ячэйкі ў галіне сьвінагадоўлі. Так, напрыклад, Старынская комсамольская ячэйка на сваім агульным сходзе абавязала кожнага комсамольца даглядаць, выгадаваць адну сьвіньню ў сваім колгасе, але пастанова засталася пастановай, а практычнага ячэйка ў гэтым напрамку нічога не зрабіла.

Бязьдзейнічаюць у галіне сьвінагадоўлі: **Рудзенская, Дукорская, Матараўская комсамольскія ячэйкі.**

Рыгор Малаток.

Організоўваем новыя колгасы

У Хутарскім сельсавеце, Чэрвеньшчына, за ўвесь 1929-30 год быў організаваны толькі адзін колгас „Комунар“.

Партыйная ячэйка, на чале якой стаяў контррэволюцыйны агэнт (Калтовіч), ігнаравала працу з беднатой і ня мела ніякага аўтарытэту сярод працоўнага насельніцтва Дзякуючы друку і ў прыватнасьці газэце „Чырвоная Зьмена“, контррэволюцыйныя агэнты **былі выкрыты і выключаны з шэрагаў КП(б)Б.**

За апошні час Чэрвеньскі РК КП(б)Б накіраваў на працу ў наш сельсавет моцна падрыхтаваных партыйцаў, якія здолелі організаваць працу сярод активу і працоўнага насельніцтва вёскі. За 2 дыдні ў сельсавеце організавалася два колгасы—адзін у вёсцы Матусава Галава пад назвай „Ленінскі Шлях“, у які ўступіла ўся вёска ў ліку 25 гаспадарак.

У час правядзеньня хлебазагатовак у пасёлку Палянка № 1 організоўвася колгас, у які ўступіла 12 гаспадарак.

Клясавыя ворагі кулакі ня спалі. У час правядзеньня сходу ў вёсцы Матусава Галава быў вывешан контррэволюцыйны верш, які заклікаў сялянства няісьці ў колгасы і аднавіць уладу капіталістых. Кулакі Шымковіч і Варнікоўскі Норбіт пралезьлі ў колгас „Ленінскі Шлях“.

С. Ц.

ВЕРНЕМ КРАІНЕ ЛЯСНЫ ДОЎГ

Бюлэтэнь барацьбы за прамфінплян лесазаводу № 13 выдаецца адзін раз у пяцідзёнку

№ 3 Менск—Віцебск № 3

„Галоўным і рашаючым недахопам у гаспадарчай рабоце застаецца няўменьне арганізаваць і стаць на чале ўзрастаючай актыўнасьці рабочае клясы. Ня гледзячы на гіганцкі размах соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на фабрыках і заводах, нашыя гаспадарчыя, профэсыйныя, комсамольскія і партыйныя організацыі ня рэдка адстаюць у гэтай справе, а падчас опортуністычна плятуцца ў хвасьце пролетарскага актыву“ (з адозвы ЦК УсеКП(б).

ЛЕСБЕЛ СТАВІЦЬ ПАЛКІ У КАЛЕСЫ

замест конкрэтнай дапамогі заводу ліквідаваць прарыў

На шэраг напамінкаў і просьбаў лесазаводу дапамагчы яму набыць патрэбныя часткі да машын, бюрократы з Лесбелу адказвалі абяцанкамі, спачуваньнямі і казённымі рэзолюцыямі.

Патрабуем прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыкаў прамфінпляну

Па шляху пералому

Віцебскі лесазавод № 13 стаў на шлях пералому

Калі адміраюць „об‘ектыўныя“

Непаладкаў на заводзе было і ёсьць багата. Нераспарадчасьць трыкутніка, нежаданьне змагацца і перамагаць цяжкасьці далі свае вынікі:

Завод ганебна недавыконваў прамфінпляны і апраўданьне гэтаму ўвесь час знаходзілі ў „об‘ектыўных“ прычынах. Калі-ж узьнялася творчая інцыятыва рабочых, калі колектыў ўсе свае сілы накіраваў на перамогу цяжкасьцяй—тады „об‘ектыўныя“ пачалі адміраць.

Так сканала першая

Абсталяваньне заводу цалкам імпортнае. Рамы з адпаведнымі часткамі прывозяцца з Швэцыі. Замежныя часткі рам не прыстасаваны да нашых тэмпаў, часта ламаюцца і тады машына прымушана стаяць. **Без астановак не выходзіцца ні адзін дзень.**

10-га верасьня самая хуткаходная рама зашумела. Зашумела і стала. Прычына астаноўкі,—лопнуў па невядомых прычынах валікавы падшыпнік.

— Што рабіць? Пачынаюць шукаць выхад. Шукалі, думалі, разважалі... Нехта паехаў на лесапільны завод, які знаходзіцца ля Ленінграду, другі прапанаваў пасьлаць заказ у Швэцыю, а рама стаяла. 6 дзён прастаяла рама пакуль рабочы, тав. ПАРЭЦКІ, не адшукаў патрэбнага падшыпніка на другім заводзе.

Рама пашла. Такім чынам пры жаданьні і правільным скарыстаньні нашых уласных магчымасьцяй, сканала першая, адна з галоўнейшых страшэнных „об‘ектыўных“.

Павінна сканаць і астатняя

І ня толькі з замежнымі часткамі можна пры жаданьні вырашыць пытаньне. Гэта падцьвярджае цэлы шэраг фактаў з заводзкага жыцьця.

Комсамольская ячэйка, якая доўгі час не працавала і не атрымоўвала аніякай дапамогі з боку парт‘ячэйкі і гаркамолу, зараз пачала разгортваць сваю работу, і гэта „об‘ектыўная“ бязьдзейнасьць будзе разьбіта.

Шматтыражка „Першы ўдарнік“, якая доўгі час ня выходзіла, пры адпаведным націску вышла. Цэлы шэраг іншых аналёгічных фактаў гавораць за тое, што **ўсякія „об‘ектыўныя“ прычыны ня могуць быць падставамі для апраўданьня прарываў.** Узьнімаецца грамадзкая думка вакол барацьбы з прарывамі. Гэтымі днямі па ўсіх цэхах створаны ўдарныя скразныя брыгады. Некаторыя рабочыя падаюць заявы ў партыю, замацоўваюць сябе за заводам. Гэта ўжо довад зруху, які вызначыўся на заводзе.

Але канчатковага пералому яшчэ няма.

Аб справах трэстаўскіх

Лесбел, які ведае лесазаводам, вядзе часам **шкодніцкую політыку, політыку нярухомасьці і нячуласьці да заводзкіх спраў.**

Шэраг фактаў пацьвярджае гэта. Лесбел выпісвае машыны без запасных частак і наадварот—выпісваюцца часткі да машын, якім яны не патрэбны. Звароты адміністрацыі заводу ў трэст сустракаюцца там „папяровым“ агнём і ня больш.

Пры такіх адносінах да справы з боку трэсту ліквідацыя прарыву адцягваецца. Адпаведныя органы павінны зацікавіцца станам кіраўніцтва з боку Лесбелу заводамі і сказаць па гэтаму пытаньню сваё слова.

Л. Глезэр.

Патрабаваць большай адказнасьці

Невыкананьне прамфінпляну на нашым заводзе здарылася па віне як адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсоналу, так і саміх рабочых. Тэхнічны нагляд хутка не сыгналізуе аб недахопах, не забясьпечвае варштатаў матар‘яламі і адпаведнымі часткамі.

Варштатныя безадказна адносяцца да варштатаў, рамшчыкі пакідаюць рамы на памочнікаў і вінтаўшчыкоў, якія з працай не спраўляюцца, з-за чаго памяншаецца падача. Рамы працуюць няпоўнай нагрузкай. Маюцца яшчэ і горшыя факты, калі ў час адсутнасьці рамшчыкаў, ламаюцца колы. Такі факт быў з рамай № 2, у якой зламалася кола для падачы верхняга ёжыка. Такіх фактаў бывае шмат. Замершчыкі таксама часта пакідаюць варштаты на памочнікаў, а самі пагульваюць па корпусу заводу.

Дошкі прапушчаюць праз зэймэр бяз усякай эканоміі. Калі-ж зьбіраецца завал, прыдзе замершчык і замест таго, каб прапускаць кожную дошку праз зэймэр паасобку, прапушчае па 2-3. Гэтым псуецца матар‘ял.

Толькі пры ўмове, калі варштатныя будуць адчуваць большую адказнасьць за работу, тады яны змогуць патрабаваць ад рабочага большай інтэнсыўнасьці працы, а ўсё гэта будзе спрыяць выкананьню прамфінпляну. Гаспадарчыя органы, завадзкі камітэт не праводзяць ніякай растлумачальнай работы аб абавязках рабочага і варштатніка. **Асабліва кульгае маса-выхаваўчая работа сярод уноўпрыходзячых рабочых.** Сярод іх не праведзена належная растлумачальная работа і пра соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Толькі тады, калі мы ўсімі сіламі возьмемся за адзіную работу, тады, **калі кожны з нас будзе адчуваць адказнасьць перад сваім таварышом і перад усёй клясай, тады мы зможам прамфінплян выканаць з правышэньнем.**

Рабочы.

НА ЗАВОДЗЕ ПРАРЫЎ, А Ў ЛЕСБЕЛЕ НЯ ТУРБУЮЦЦА

Патрабуем умяшаньня адпаведных органаў

Бюрократычнае кіраўніцтва трэсту Лесбел--адна з прычын прарыву на нашым заводзе. Разглядаючы прычыны прарыву, нельга прайсьці міма фактаў нячулых, непаваротлівых і бюрократычных адносін да заводу з боку трэсту.

Бюро партыйнай ячэйкі, улічваючы прарыў, своечасова інформавала, комчастку трэсту аб гэтым, спадзяючыся, што тая хутка адгукнецца на трывожны сыгнал і вызначыць конкрэтныя захады для ліквідацыі прарыву. У адказ атрымалі кароткае, сухое паведамленьне:

Мы паслалі лісты,— азнаёмцеся з імі

„Заводакіраўніцтву паслана шэраг дырэктыўных лістоў, можаце з імі азнаёміцца“. А гэты „шэраг дырэктыўных лістоў“ перапоўнены такімі словамі: **мобілізаваць, нажаць, пакрыць, выжыць, ліквідаваць, ануляваць.** Вось вам і конкрэтныя ўказаньні трэстаўскіх кіраўнікоў!

Трэба выгрузіць лес з рэчкі. У Віцебску рабсілы не хапае, ледзь-ледзь набралі палову неабходнай колькасьці рабочых, а ле і тыя выставілі патрабаваньні—**дайце боты, палепшыце харч; возчыкі патрабавалі аўсу для коняй.** Заводакіраўніцтва зьвяртаецца ў трэст з просьбай, каб той праз Белрабсэкцыю забясьпечыў сэзонных рабочых прамтаварамі і продуктамі. На гэта трэст нават не паклапаціўся даць адказ, адбаярыўся дырэктывай: **выгрузка павінна быць скончана да 15 кастрычніка.**

„Пачакайце да другога году“

Выкананьне прамфінпляну непарыўна зьвязана з агульнажыцьцем, харчаваньнем і забясьпечаньнем. Гэтым пытаньнем патрэбна ўдзяляць шмат увагі. У нас-жа сталоўка ніякім чынам ня можа абслужыць 600 чалавек рабочых. Пытаньне аб пашырэньні сталоўкі перад трэстам ставілася своечасова, але і тут адказ: **Пашырыць сталоўку ў гэтым годзе не дазваляем.** Уключым у каштарыс наступнага опэрацыйнага году... А тым часам, рабочыя ня маюць дзе есьці, з-за гэтага павялічваюцца спазьненьні на работу.

Адна з асноўных прычын прарыву—вялікія прастоі варштатаў з-за паломак ляфэтак у хуткаходных рамах. Усе ляфэткі прашлі па некалькі раз аўтагонную зварку,—адсюль частыя паломкі. Паўстае пытаньне—няўжо так цяжка набыць новыя ляфэткі, калі іх адліўка ня зьвязана з ліцэнзіямі, залатой валютай і г. д.?



Бюрократычнае кіраўніцтва Лесбелу „ня бачыць“ прарываў на заводзе

6 месяц ў назад заводакіраўніцтва паслала ў трэст заказ на 8 новых ляфэтак. Але на тэрміновы і неабходны заказ з трэсту атрымалі адказ: „Ваш заказ на 8 ляфэтак можа быць выкананы не раней, як праз 6 месяцаў“. Што заставалася рабіць пасьля такога халоднага адказу? Пад націскам заводзкай грамадзкасьці заводакіраўніцтва паслала свайго інжынэра ў Ленінград для адліўкі ляфэтак. Ляфэткі былі адліты на працягу месяца. Але і тут здарылася чарговая „перашкода“. Прыехаўшы інжынэр трэсту Сульскі, пасля агляду ляфэтак, прызнаў іх няпрыгоднымі. Зноў завод працуе з перабоямі. Зноў па аддзелах трэсту вандруюць прадстаўнікі заводу, просяць і моляць аб новых ляфэтках. Іх уцяшаюць, абяцаюць і спакойна кладуць рэзолюцыі. А ляфэтак пакуль што няма.

З рэштаю запасных частак справа таксама ня лепш. Прысланая рама „Машына-Вэркер“ ня мае ня толькі ніводнае запаснае часткі, а нават і ваганэтак, якія звычайна прысылаюцца з рамамі. Хуткаходная, навейшай конструкцыі, рама выпускае бракаваны матар‘ял, а ваганэткі да гэтага часу ўсё „вязуць“.

Шарыкавых падшыпнікаў, якія часта ламаюцца, для машыны „Веркер“, прывезьлі толькі адзін. Зламаўся падшыпнік і рама выбыла са строю на тыдзень. Падшыпнік знайшлі на Заходня-дзьвінскім заводзе трэсту „Фанера-Дзьвіналес“, які з цяжкасьцю быў атрыман заводам.

А тут залішняя клапатлівасьць

Завод мае два пілаточныя варштаты,—адзін аўтаматычны, другі просты. Для заводу-ж патрэбен адзін варштат. І вось тут трэст праяўляе залішнюю клапатлівасьць аб заводзе і **пасылае нам не адзін пілаточны варштат, а цэлых 4, у той час, калі на другіх лесапілках затрымліваецца работа з-за адсутнасьці пілаточных варштатаў. Тое самае здарылася і з запаснымі часткамі для нашага лёкомобілю.** Вывад можа быць адзін. У праўленьні трэсту Лесбел заселі чыноўнікі і бюрократы, якія зрываюць вытворчую програму. У апараце трэсту бязумоўна, мякка кажучы, маецца самае агіднейшае галавацяпства, альбо шкодніцтва. Тое і другое трэба вырваць з карэньнем. І гэтым павінна заняцца прокуратура.

Рабкоры: А. А., І. А. і К.

Ганьба лятуну, прагульшчыку, гультаю

Яны шкодзяць вытворчасьці, здраджваюць інтарэсам рэволюцыі

Пракалушчанка--вінавайца двухгадзіннага прастою

11 верасьня спыніла працу саматаска на першым элеватары—дзесятнік - **комсамолец Пракалушчанка, замест наладзіць саматаску, сабраў рабочых у будку** і дзьве гадзіны зьбіваў бімбікі. Пры жаданьні прастой мог быць ня больш 15 хвілін.

Толькі, калі прышоў старшы сартоўшчык, Пракалушчанка стаў клапаціцца аб папраўцы саматаскі. Сваімі ўчынкамі Пракалушчанка паказаў сябе не комсамольцам-ударнікам, а ілжэ-ударнікам. Ячэйка комсамолу павінна безадкладна разгледзіць паводзіны комсамольца Пракалушчанка.

М. Г. Харытонаў.

Лепш скарыстайце рабочую сілу

Шмат прастояў бывае з-за няправільнай растаноўкі рабочае сілы. На адну і тую самую работу кожны дзень ставяцца новыя рабочыя. Бываюць выпадкі, што на цяжкую работу ставяць падлеткаў, якія з рабатай не спраўляюцца. Асабліва па-галавацяпску разьмяркоўвае рабочую сілу наглядальнік **Эпштэйн.**

Трэба прыцягнуць да адказнасьці ўсіх, хто перашкаджае выкананьню прамфінпляну.

І. Жохін.

Неадмахвайцеся ад навічкоў

За апошнія часы наглядаюцца вялікія прастоі з-за недахопу лесу. З 4 па 9 верасьня на аднэй зьмене прастоі раўняліся 22 гадзінам і 13 хвілінам, з якіх 11 гадзін і 54 хвіліны—з-за адсутнасьці лесу.

Гэтыя перашкоды могуць быць зьнішчаны пры ўмове, калі сярод рабочых, якія працуюць на выгрузцы лесу, будзе разгорнута соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Сярод рабочых навічкоў ніякай выхаваўчай работы не вядзецца. Гэтаму трэба пакласьці канец.

Х. Мерзьляк.

Спыніць продаж дроту прыватніку

На выгрузцы лесу, дрот, які застаецца ад разгрузкі, рабочыя павінны здаваць у заводзкую кладовую, атрымліваючы за гэта па 96 кап. за 16 кілё.

Аднак, ёсьць рабочыя, якія гэты дрот прадаюць прыватніку, атрымліваючы за гэтыя-ж 16 кілё тры рублі.

Перапродажам дроту займаецца група **Качаповіча**, у якой знаходзіцца і прэміяваны рабочы **Стральцоў.** Трэба прыняць захады, каб ніводнае кілё дроту не пападала на прыватны рынак.

Х. Н.

Адказ рабкорам заводу

Ходыраву—Заметка „Прарыў ліквідаваць“ зьмяшчацца ня будзе. У заметцы няма ніякіх конкрэтных прапаноў аб ліквідацыі прарываў,—агульныя развaжаньні.

Групе рабкораў—Заметка пра дэзэртыраў і лятуноў ня пойдзе. Гаворачы аб лятунох, трэба прыводзіць прозьвішчы лятуноў, гаварыць аб конкрэтных носьбітах зла, гэтага ў вашым дапісе не хапае.

Рэалізуем адозву ЦК

Данясеньні нашых юнкораў

ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА І ДРУГАЯ ЗЬМЕНА ГУТЫ „КАСТРЫЧНІК" ПЕРАВЫКАНАЛІ ПРАМФІНПЛЯН

Плятуцца ў хвасьце вязальшчыцы 1-ай зьмены

Абрэзаць крыльле лятуном—патрабуюць старыя рабочыя Віцебскай гарбарні

ЗВОДКА

аб выкананьні прамфінпляну на 25-ае верасьня па ф-цы „Кастрычнік"

Па пляну, першы агрэгат павінен быў зрабіць 17.000 паліто, зрабіў—17.033 альбо 100,2 проц. Другі агрэгат, маладзёжны, павінен быў зрабіць 17.000 паліто, зрабіў—17.283 альбо 101,66 проц. і трэці агрэгат, замест 25.050 па пляну зрабіў—25.333, альбо 101,13 проц.

Па ўсёй фабрыцы прамфінплян выканан на 100,98 проц.

ЗРУХ ЁСЬЦЬ, БУДЗЕМ ТРЫМАЦЬ ТАКІЯ-Ж ТЭМПЫ І НАДАЛЕЙ

Рапарт другому зьлёту ўдарнікаў заводу „Кастрычнік" „Чырвонай Зьмене"

Да адозвы ЦК у нашай зьмене быў адзін колектыў з 14 ударнікаў. Апрача нас ударных брыгад ня было. Самакрытыка была разгорнута слаба, цэхільлічоўка ня выходзіла.

Зараз, абгаварыўшы адозву ЦК УсеКП(б), 40 чалавек закантрактаваліся да канца пяцігодкі. Ударнікамі імя 3-га году пяцігодкі ўступіла 44 чалавекі,—такім чынам з 90 рабочых нашай зьмены—58 ударнікаў. Бярэм на буксір адстаючыя варштаты. Пачала выходзіць „Ільлічоўка". Вядзем барацьбу з прагульшчыкамі і ілжэўдарнікамі шляхам грамадзкага ганьбаваньня і пазбаўленьня званьня ўдарнікаў. Мы так зрабілі з комсамольцам А. Венцалем.

Перавыканалі заданьне па падпіцы на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" на 320 рублёў і ўзялі на грамадзкі буксір 4-ую зьмену выдувальнага цэху. Лічбы прамфінпляну выконваем.

Мы будзем і надалей упарта змагацца за выкананьне і перавыкананьне лічбаў і трэцяга году пяцігодкі.

По даручэньню ўдарнікаў сэкратар ячэйкі КП(б)Б 1-ае зьмены ЯНКА ДЖЫВОЎСКІ.

Другая зьмена перавыконвае заданьне

Першая—ганебна адстае

Ад работы вязальнага цэху ў значнай меры залежыць ліквідацыя прарыву на заводзе. Вязальшчыцы добра разумеюць гэта,—работа другой зьмены гэтага цэху сьведчыць аб гэтым.

Работніцы гэтай зьмены: Асьверынская, Брыкальская, Фінкельштэйн, Мацюкоўская, Фурман, Доўнар, Баранава, Купрыненка, Багдановіч сыстэматычна перавыконваюць прамфінплян.

За першую дэкаду верасьня другая зьмена вязальнага цэху выпрацавала 250218 штук замест 235 тыс. па пляну. Браку замест 0,5—па пляну, 0,3 проц.

Гэтага нельга сказаць пра вязальшчыц першай зьмены. З усёй зьмены толькі адна Гальперына перавыконвала заданьне, а ўся зьмена адстае. За першую дэкаду верасьня 1-ая зьмена павінна была выпрацаваць 222500 штук, а выпрацавала 197602 штукі. Гэта ставіць перад другой зьменай задачу.

Узяць на грамадзкі буксір работніц першай зьмены і аказаць ім практычную дапамогу. Вязальны цэх павінен напружыць усе сілы на ліквідацыю прарыву.

К,

Завод „Кастрычнік"

Абрэзаць крыльлі „лятуном"

Цякучасьць рабочай сілы зьяўляецца адным з тармазаў выкананьня прамфінпляну. Частка рабочых, якая яшчэ ня мае вытворчага гарту, свае капеечныя інтарэсы ставіць вышэй за інтарэсы рабочае клясы, займаюцца „лятунствам", перабежкай з аднаго заводу на другі ў пагоні за большым заробкам, чым і зрываюць выкананьне прамфінпляну.

У адказ на адозву ЦК, мы,—рабочыя попельнага аддзяленьня Віцебскага скуранога заводу—абвяшчаем рашучую барацьбу лятунам, прагульшчыкам і рвачам. Мы патрабуем ад адміністрацыі прыняцьця рэпрэсыўных захадаў да тых, хто імкнецца перашкаджаць нашай рабоце.

З свайго боку, мы абавязуемся, ня гледзячы на цяжкасьці, якія сустракаюцца і будуць сустракацца на нашым шляху, не пакідаць завод да канца пяцігодкі. Не рабіць прагулаў і спазьненьняў.

Выклікаем пасьледваць нашаму прыкладу ўсіх рабочых заводу і штамповачнага цэху.

ТАМАШЭЎСК—рабочы стаж 25 год, КОТКІН—24 гады, КУРУЛЕНКА—23 гады, КЛІМОВІЧ—25 год, ГЕЛЬМАН—20, ЗАЙЦАЎ—36, БОРЭДО—30, ШЫФРЫН—23, ПЯТРОЎ П.—12 год, БРАНЗБУРГ—10 год, АЗАР—37 год,—АЛЬТМАН—12 год і ЯСЬЦЮКЕВІЧ—38 год.

Віцебск, Скурзавод

Штурмуем прарывы

У адказ на адозву ЦК, партыйна-комсамольская організацыя фабрыкі перавяла сябе на ваенны стан. Складзен баявы штаб для штурму, які разьлічыў заданьні па гадзінах, днях і зьменах для ліквідацыі прарыву.

За партыйна-комсамольскай часткай пасьледвала і рэшта рабочых. На мітынгу, скліканым для абгаварэньня адозвы, падаваліся сьпісы з просьбай закантрактаваць за фабрыкай да канца пяцігодкі. З 140 рабочых набівачнага цэху закантрактавалася 100. У экіпіровачным цэху—60 чал. Організаваны тры сквозныя брыгады. Расьце лік ударнікаў імя 3-га году пяцігодкі.

Комсамольскі колектыў організаваў **пяць комсамольскіх брыгад-комун**, у якіх удзельнічаюць і дарослыя рабочыя. Пачалі выходзіць цэхавыя газэты, складзен грамадзкі буксір. Рабочыя ўнесьлі свае абліґацыі пазыкі ў беззваротны фонд індустрыялізацыі.

Усе цэхі рыхтуюць сустрэчныя прамфінпляны, якія перавышаюць кантрольныя лічбы, выстаўленыя адміністрацыяй. Упаковачны цэх Старой Бярэзіны бярэ на сябе даць абавязак у зьмену, замест 500,—540 скрынь. Набівачны цэх гэтай-жа фабрыкі падзелен на групы. Рабочыя „Пролетарскай Перамогі" бяруцца ўпакоўваць у зьмену 50 тысяч скрынь, замест 48000. Гэтая-ж фабрыка ўжо зрабіла значны крок наперад, выканаўшы прамфінплян на 80 проц., замест 72 у мінулым месяцы. Рабочыя „Чырвонай Бярэзіны" і „Пролетарскаі Перамогі", у ліку 4000 чал., у адказ на адозву ЦК, адказваюць штурмам прарываў.

Юнкор „Ч. З." З. Гурэвіч.



Ударніца за працай

Насьценгазэта ня ўключылася ў барацьбу

Фабрыка „Чырвоны Тэкстыльшчык" за 11 месяцаў выканала прамфінплян на 74,6 проц. Для ліквідацыі прарыву комсамольская ячэйка мобілізавала 6 комсамольцаў у матальны цэх і 10 фармоўшчыкаў у сартовачны цэх.

Комсамольскі колектыў цалкам абвясьціў сябе мобілізаваным і закантрактаваным за фабрыкай да канца пяцігодкі. Не мобілізавалася толькі на ліквідацыю прарыву фабрычная насьценгазэта.

Пост „Чырвонай Зьмены"

А. Ізраіцель.

Баявыя пролетарскія выступленьні ў Баўгарыі

Па ўсёй краіне былі распаўсюджаны лістоўкі компартыі і комсамолу

ВЕНА. 25. Баўгарская компартыя організавала 23 верасьня, у гадавіну паўстаньня 1923 г., пролетарскія выступленьні.

Па ўсёй краіне распаўсюджаны былі лістоўкі компартыі і комсамолу. На стадыёне ў Софіі комуністым удалося вывесіць чырвоны сьцяг.

Ня гледзячы на забарону паліцыі ў Софіі адбылося некалькі сходаў, якія былі разагнаны паліцыяй.

За апошнія тыдні да гадавіны паўстаньня рабочая газэта „Рэха" сыстэматычна конфіскоўвалася.

МАНЭЎРЫ АНГЕЛЬСКІХ КАРАБЛЁЎ У ВОДАХ ГРЭЦЫІ

Мэта манэўраў—падрыхтоўка да прыстасаваньня ангельскага флёту ў Сяродземным моры ў выпадку вайны з СССР

ВЕНА. 26. Згодна паведамленьняў з Афін, грэцкае міністэрства замежных спраў атрымала ад ангельскага ураду паведамленьне, што ў кастрычніку ў грэцкія гавані прыбудуць ангельскія ваенныя судны.

У Фоліно (каля Атэн) прыбудзе адзін броняносец і тры другія ваенныя караблі.

У Корфу прыбудзе пяць броняносцаў і 39 іншых адзінак ангельскага флёту.

У Судас прыбудзе два ваенныя караблі і пяць падводных лодак.

На выспу Спэца прыбудзе эскадрон падводных лодак.

Надыходзячыя морскія дэмонстрацыі Ангельшчыны ў Сяродземным, Эгейскім і Сіоніскім морах расцэньваюцца як падрыхтоўка да прасоўваньня ангельскага флёту ў Сяродземнае мора ў выпадку вайны з СССР.

Хваля забастовак у Гішпаніі

У шэрагу гарадоў адбыліся крывавыя сутычкі рабочых з паліцыяй

ПАРЫЖ, 25. „Юманітэ" паведамляе аб шырокай забастовачнай хвалі ў Гішпаніі. У Малазе бастуюць докеры. Рыхтуюцца да забастоўкі, у знак солідарнасьці з докерамі, будаўнікі.

У Мадрыдзе і іншых мясцох часткова бастуюць мэталістыя і будаўнікі. Усеагульная 48-гадзінная забастоўка ў Луго ўзьнікла ў знак протэсту супроць паліцэйскага тэрору.

Горад аб'яўлен на „асадным становішчы". У сутычках бастуючых з штрэйкбрэхерамі і жандармэрыяй паранена 5 рабочых і 2 жандармы.

Гішпанскі ўрад забараніў газэтам паведамляць аб забастовачным руху.

Паведамленьні

28 верасьня а 7 гадзіне ўвечары ў памяшканьні Цэнтральнага Піонэрскага Клюбу (Савецкая, 90) склікаецца раённая нарада піонэр-комсамольцаў усіх атрадаў Фрунзэўскага раёну.

Яўка ўсіх піонэр-комсамольцаў абавязкова. Сэкратарам ячэек і важатым атрадаў забясьпечыць своечасовую яўку.

ФРК ЛКСМБ.

Менскі Політэхнікум паведамляе ўсіх студэнтаў, прынятых на 1-шы курс, што выклік іх на заняткі будзе праводзіцца ў два навараты. Студэнтам, якім зараз рассылаюцца спэцыяльныя позвы з паказаньнем зьявіцца 1-га кастрычніка 1930 году, павінны прыбыць у Тэхнікум 1-га кастрычніка а 9 гадзіне раніцы.

Студэнты, якім зараз рассылаецца паведамленьне, што яны выклікаюцца на заняткі 1-га студзеня 1931 году, з раз не павінны ехаць у Тэхнікум, бо Тэхнікум іх ня прыме і ніякай матар'яльнай адказнасьці не нясе за страту сродкаў на праезд.

Дырэкцыя Тэхнікуму.

Сёньня 28 верасьня а 6 гадз. увечары ў памяшканьні рэд. газ. „Чырвоная Зьмена" (Карла Маркса, 38), адбудзецца нарада „лёгкай кавалерыі".

Павінны зьявіцца ад рабфаку—10 чалавек, завод „Энэргія"—5 чал., зав. „Комунар"—5 чал., „Дрэваапрацоўшчык"—5 чал., і „Беларуска"—5 чалавек.

Усім зьявіцца своечасова без спазьненьня.

Рэдакцыя „Чырвоная Зьмена".

Адказны рэдактар—Рэдколегія

Галоўлітбел № 599

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна